Луйгас Н.Я. Роля навуковых школ у даследаванні праблемы беларускай сям’і 80-90-х гг. ХІХ ст. // Весці НАН Беларусі. – 2010. – № 1. – С. 84-90.

# Роля навуковых школ у даследаванні праблемы беларускай сям’і 80-90-х гг. ХІХ ст.

80-90-я гг. ХІХ ст. у даследаванні праблемы беларускай сям’і характарызуюцца актыўным уключэннем мясцовых даследчыкаў у распрацоўку тэмы. Адметна, што збор і публікацыя матэрыялаў адбываліся паралельна са з’яўленнем буйных прац па гісторыі, сучасным стане сям’і і абраднасці беларусаў. З цягам часу менавіта гэтыя працы стануць залатым хрэстаматыйным фондам айчыннай этнаграфіі. Гэты перыяд гістарыяграфіі праблемы беларускай сям’і характарызуецца з’яўленнем шматтомных выданняў запісаў радзіннай, вясельнай, пахавальнай абраднасці. Заслуга ў гэтай справе належыць найбольш плённым збіральнікам: П.В.Шэйну, Е.Р.Раманаву, А.А.Шлюбскаму і інш.

Так, у прыватнасці, значная колькасць фактычных дадзеных у “Матэрыялах для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю” прадстаўлена П.В. Шэйнам, дзякуючы яго карэспандэнтам з Мінскай, Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Смаленскай і інш. губерняў. Тут лакальныя апісанні радзінных, вясельных і пахавальных абрадаў змешчаны разам з фальклорнымі тэкстамі [1].

Радзінная, вясельная, пахавальна-памінальная абраднасць у кантэксце стрыжнёвых аспектаў жыццядзейнасці сялянскай сям’і Магілёўскай губерні змешчана ў працы Е.Р.Раманава “Быт беларуса” [2].

Разгляд радзінных, вясельных, памінальных абрадаў і звычаяў на Віцебшчыне, а таксама сямейнага звычаёвага права надрукаваны ў другой частцы фальклорна-этнаграфічнай працы А.А.Шлюбскага “Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны” [3].

Сярод буйных даследчыкаў, якія вызначылі новы абрыс гістарыяграфіі праблемы сям'і беларусаў, варта адзначыць М.В.Доўнар-Запольскага, У.М. Дабравольскага, М.Я.Нікіфароўскага, Я.Ф.Карскага і інш.

Значны ўклад у распрацоўку праблемы беларускай сям'і быў зроблены М.В.Доўнар-Запольскім. Першая яго спроба вывучэння беларускага вяселля і вясельных песняў выяўлена ў 1888 г. [4]. Аўтар вызначыў апісанне вясельнага рытуалу як этнаграфічны эцюд: у ім зафіксаваны ўласныя назіранні вяселля ў Рэчыцкім і Мазырскім паветах Мінскай губерні.

У "Нататках па беларускай этнаграфіі" М.В.Доўнар-Запольскі закранае пытанні дашлюбных стасункаў сярод моладзі [5]. Дзевяты раздзел працы, прысвечаны вывучэнню вячорак, ігрышчаў, поглядаў на цнатлівасць дзяўчат, напісаны па ўласна аўтарскіх матэрыялах і паведамленнях карэспандэнтаў. Найбольш часта сустракаюцца спасылкі на Пінскі, Рэчыцкі, Мінскі, Мазырскі паветы Мінскай губерні.

Аўтар падае цікавыя з этнаграфічнага пункту гледжання звесткі пра месцы знаёмства вясковай моладзі (фэсты, кірмашы, прошчы), спосабы баўлення вольнага часу на вячорках, ігрышчах і выяўлення ўзаемнай сімпатыі маладымі людзьмі, закранае пытанні інтымнай блізкасці ў дашлюбны перыяд, народнага погляду на цнатлівасць нявесты і жаніха, свабоды выбару суджанага і інш.

М.В.Доўнар-Запольскага з поўным правам можна назваць аўтарам першай у беларускай этнаграфіі класіфікацыі вясельнай абраднасці [6]. Ідэя выяўлення агульных заканамернасцей у гісторыі некаторых славянскіх шлюбных абрадаў у параўнальна-гістарычным кантэксце з аналагічнымі еўрапейскімі абрадамі (усходне-, заходне-, паўднёваславянскіх і неславянскіх народаў) падштурхнула даследчыка да пошуку паралеляў у сучаснай і мінулай абраднасці індаеўрапейскіх народнасцей. Беларускае вяселле прааналізавана ў культурна-рэлігійных перажытках.

М.В.Доўнар-Запольскі будуе схему вясельнага цыкла, дзе большая частка звычаяў і абрадаў адносіцца ім да радавой арганізацыі грамадства і

разглядаецца ў якасці перажыткаў умыкання, куплі-продажу, а таксама рэлігійных рэшткаў эпохі гетэрызму. Так, напрыклад, сватанне і запоіны класіфікуюцца як перажыткі куплі-продажу нявесты [6, с. 66], дружына жаніха – як радавы полк-заваёўнік, з дапамогай якога адбываецца ўмыканне нявесты з другога роду [6, с.68], плата за цнатлівасць і абрадавы танец нявесты – як перажыткі эпохі гетэрызму [6, с. 76], абрад злучэння рук маладых – як перажытак умыкання [6, с. 89 ].

Аўтарская мэта “выбраць цікавыя з этнаграфічнага пункту гледжання факты і паставіць іх у сувязь з паралельнымі фактамі з рытуалаў індаеўрапейскіх народнасцей” прадугледжвала толькі высвятленне паходжання ў сучаснай абраднасці культурна-рэлігійных перажыткаў і тлумачэнне сутнасці вясельных звычаяў і абрадаў [6, с. 62].

Варта адзначыць, што прапанаваны прынцып класіфікацыі пратрымаўся ў айчыннай этнаграфіі больш за 60 гадоў, пакуль у 1956 годзе не была распрацавана іншая класіфікацыя беларускай вясельнай абраднасці М.М.Нікольскага.

Зварот М.В.Доўнар-Запольскага да вывучэння першабытных формаў шлюбу хутчэй за ўсё матываваны актуальнай дыскусіяй у заходнееўрапейскай і амерыканскай этнагафіі ў галіне дагісторыі манагамнай сям’і [7]. Аўтар ставіць задачу прадставіць прадмет даследавання – формы шлюбу ў іх развіцці – ў тым выглядзе, як ён трактуецца ў сучаснай даследчыку навуцы [7, с. 385]. Крыніцазнаўчую базу склалі працы гісторыкаў, філосафаў, пісьменнікаў старажытнага і новага часу. У агульнасусветны кантэкст М.В.Доўнар-Запольскі ўключае тэматычныя распрацоўкі, якія датычаць славян, у тым ліку і беларусаў.

На ўзроўні метадалогіі тагачаснай навукі пад уплывам эвалюцыянізму этнограф выкарыстоўвае метад перажыткаў для пошуку рэшткаў (слядоў) першабытнага жыцця ў сучаснай духоўнай культуры цывілізаваных народаў і называе яго метадам Дж.Лёбака. Аднак зараз дакладна ўстаноўлена, што метад перажыткаў увёў у навуковы зварот Э.Б.Тайлар [8]. М.В.Доўнар-

Запольскі знаходзіць прыклады рэшткаў культаў рэлігійнага гетэрызму ў язычніцкай рэлігіі і сучасных абрадах славян: у беларускім паданні пра Ярылу, характары вячорак, матывах вясельных абрадаў, падарунках, якія робіць жаніх альбо яго бацька нявесце [7, с.393]. Нягледзячы на тое, што ў даследаванне не былі ўключаны такія буйныя даследаванні па гісторыі першабытнага грамадства і шлюбу, як “Першабытны шлюб” Дж.Мак-Ленана (1865 г.), “Старажытнае грамадства” Л.Моргана (1877 г.), Ф.Энгельса “Паходжанне сям’і, прыватнай уласнасці і дзяржавы” (1884 г.), аўтарскай заслугай можна лічыць спробу ўключыць матэрыялы па гісторыі славянскай сям’і ў кантэкст сусветнай мадэлі развіцця чалавецтва.

М.В.Доўнар-Запольскі – даследчык сямейнага звычаёвага права, а з’яўленне на Беларусі прац па сямейным звычаёвым праве ўвогуле звязана са станаўленнем юрыдычнай школы. Ідэйныя вытокі гэтага працэсу знаходзім у аддзяленні этнаграфіі Імператарскага Рускага геаграфічнага таварыства, якое неаднаразова прапаноўвала вывучаць народныя юрыдычныя звычаі на падставе агульнай, а пасля і спецыялізаванай праграмы. Першыя аналітычныя даследаванні па гэтай тэме пачалі з’яўляцца на Беларусі напрыканцы XIX ст. Важна, што іх аўтары займаліся вывучэннем сямейнага звычаёвага права тых губерняў, ураджэнцамі якіх былі самі. Удалай знаходкай у гэтым сэнсе можна лічыць “Звычаёвае сямейнае права сялян Мінскай губерні” М.В.Доўнар-Запольскага (1897 г.) [9] і “Нарысы сямейных нораваў” У.М.Дабравольскага [10].

Тэматычнае падабенства прац абодвух этнографаў, як і храналагічныя межы даследаванняў, дазваляюць зрабіць параўнальны аналіз закранутых аўтарамі аспектаў.

Зварот даследчыкаў да выяўлення кола абавязкаў мужа і жонкі ў сям’і дае магчымасць зрабіць вывад пра падобнасць размеркаваных клопатаў старэйшых членаў сям’і – гаспадара і гаспадыні ў Мінскай і Смаленскай губернях. Агульным з’яўляецца прызнанасць аўтарытэту старэйшага ў сям’і, існаванне выключных правоў па распараджэнні працамі, па пытаннях

арганізацыі раздзелу сям'і, а таксама тое, што народная традыцыя ва ўзаемаадносінах паміж старэйшымі і малодшымі членамі сям'і аддавала перавагу першым з той нагоды, што "не пастаяўшы ў парозе, не сядзіш на куце" [10, с. 339], сугучнай з судовым рашэннем на Міншчыне пра падпарадкаванне членаў сям'і галаве, без чаго "не можа быць патрэбнага парадку ў гаспадарцы" [9, с. 11].

Той жа прынцып старшынства ў праве называцца гаспадыняй праглядаецца на Міншчыне і Смаленшчыне: кола функцыянальных абавязкаў жанчын у вялікіх сем'ях адпавядала нягласнай іерархіі падзелу жаночай працы, калі старэйшая размяркоўвала дзённую працу паміж нявесткамі і дольніцамі, сачыла за дзецьмі, была адказнай за своечасовасць прыгатаванай ежы, вопраткі для ўсіх членаў сям'і, чысціні ў хаце, парадку па гаспадарцы ў доглядзе за жывёлай [9, с. 13].

У пытаннях наконт правоў на спадчыну бацькоўскай гаспадаркі на Міншчыне і Смаленшчыне назіраецца аднолькавая паслядоўнасць: пасля смерці бацькі, калі сям'я ці абшчына працягвала існаваць, на яе чале станавіўся старэйшы – брат памерлага, сын, на Смаленшчыне яшчэ і пляменнік, а таксама няродныя для сям'і людзі – здольнік ці прымак на Міншчыне [9, с. 12], [10, с. 338]. М.В.Доўнар-Запольскі вызначае раўнапраўе мужа і жонкі ў пытаннях спадкаемства. На нашу думку, гэта было раўнапраўе згодна традыцыі, па якой жанчына мела права на спадкаванне бацькоўскай маёмасці, зямлі ў тым выпадку, калі не было прамых спадкаемцаў-мужчын [9, с. 13].

У.М.Дабравольскі звяртае ўвагу на распаўсюджанасць ранніх шлюбаў у часы прыгоннага права, калі дзяўчаты на Смаленшчыне выдаваліся замуж у 11,12,13 гадоў [10, с. 359]. Адметна, што абодвух даследчыкаў цікавіць пытанне, якія патрабаванні да нявесты вылучаліся бацькамі жаніха. Так, на Смаленшчыне старэйшыя звярталі ўвагу на род, багацце, працоўныя і маральныя якасці: дзяўчына павінна быць сціплай, паважна ставіцца да старэйшых, прычым у некаторых мясцовасцях Смаленшчыны асуджалася

цяга нявесты да спеваў, прыгожай вопраткі, бо гэта лічылася бескарысным заняткам. Маці звычайна раілі сынам выбіраць нявесту са свайго асяродку [10, с. 362].

У пытаннях скасавання шлюбу назіраецца агульная тэндэнцыя абараніць жанчыну і дзяцей. Згодна з дадзенымі М.В.Доўнар-Запольскага, звычай дазваляе пайсці жонцы ад мужа па прычыне жорсткіх адносінаў апошняга, аднак, калі яе адыход з'яўляецца беспрычынным, то валасны суд становіцца на бок мужа. Адметна, што калі ў разводзе маладых бралі удзел сваякі мужа і жонкі, то караліся ўсе: грамадскай працай, цялеснымі пакараннямі, грашовымі штрафамі [9, с. 20]. Паколькі фармальны развод праз царкоўнае пасрэдніцтва не практыкаваўся ў сялянскім асяродку, муж і жонка проста разыходзіліся.

Крыніцазнаўчую базу першага даследавання склалі рашэнні валасных судоў, запісаных у  Рэчыцкім, Бабруйскім, Пінскім паветах губерні, уласныя назіранні, а таксама звесткі з пісьмовых апытанняў мясцовага насельніцтва Мінскага, Наваградскага, Мазырскага паветаў. Праца ўтрымлівае шэраг тэматычных спасылак на рэзалюцыйную частку судовых спраў  як каштоўны матэрыял для аналізу матывіровак прынятых рашэнняў.

Праца У.М.Дабравольскага, змешчаная ў “Смаленскім этнаграфічным зборніку”, утрымлівае амаль тое ж аспектнае кола аналізу праблемы сям'і, як і ў М.В.Доўнар-Запольскага. Але яна пабудавана на асабістых назіраннях аўтара, паведамленнях карэспандэнтаў, дасланых з розных мясцовасцей Смаленскай губерні, прыкладах народна-паэтычнай творчасці.

Яшчэ адна праца, прысвечаная юрыдычным звычаям сялян Магілёўскай губерні, выдадзена А.Брандтам у 1904 годзе [11]. У ёй утрымліваюцца звесткі пра вясельныя абрады, адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, сямейныя падзелы, спадкаемства, дамовы пра куплю-продаж, асабісты найм, пра правапарушэнні і дзейнсць судовых устаноў.

Варта адзначыць, што і ў савецкі час былі выдадзены праграмы збору народных юрыдычных звычаяў, але, на жаль, невядома ці быў сабраны карэспандэнтамі падобны матэрыял.

Праца Я.Ф.Карскага "Нарысы славеснасці беларускага племені" займае адно з пачэсных месцаў не толькі ў плане вывучэння этнагенезу беларусаў [12]. Яна адметная як спроба даследавання народнай паэзіі ў сувязі з грамадскім развіццём заходнерускіх плямёнаў. Вучоны ўпершыню ставіць задачу вызначэння гістарычных напластаванняў, дыферэнцыяцыі самабытных і запазычаных элементаў: "… што ў народнай паэзіі трэба прыпісаць дадзенай народнасці, у чым трэба бачыць адлюстраванне праславянскай і праіндаеўрапейскай спадчыны і што, нарэшце, прыйшло збоку як запазычанне ў другога народа" [12, с. 122]. Разгляд радзіннай, вясельнай і пахавальнай абраднасці прадстаўлены ў асобным раздзеле народнай паэзіі і вытрыманы ў адпаведнасці з пастаўленай задачай.

Так, параграф, прысвечаны даследаванню песень і абрадаў пры нараджэнні чалавека, утрымлівае аналіз радзінных ксцінных, а таксама ўключае агляд вобразаў і матываў калыханкавых і ўласнадзіцячых песень.

З пункту гледжання метадалогіі варта адзначыць, што Я.Ф.Карскі звяртае ўвагу на абрады, падмурак якіх знаходзіцца ў глыбокай старажытнасці і якія дазваляюць высветліць светаўспрыняцце старажытнага творцы [12, с. 310]. Як і М.В. Доўнар-Запольскі, даследчык выкарыстоўвае тайлараўскі метад перажыткаў. Вывучэнне радзіннай абраднасці беларусаў ён зрабіў у параўнальна-гістарычным кантэксце са славянскімі і неславянскімі народамі, паспрабаваўшы высветліць час узнікнення і паходжанне асобных народных вераванняў і абрадавых дзеянняў.

Безумоўнай заслугай Я.Ф.Карскага з'яўляецца спроба размежавання міфічных і гістарычных напластаванняў як адбітку працэсу змены ступені развіцця народнага светасузірання. Напрыклад, Я.Ф.Карскі тлумачыць змену народных уяўленняў пра асабістую прыроджаную долю, якую даюць язычніцкі Род і Ражаніцы (дзевы лёсу), а пазней – Усявышні, які можа

змяніць яе ў залежнасці ад паводзінаў чалавека [12, с. 320]. Сама па сабе ідэя эвалюцыі прадстаўлена тут як змяненне формаў. Падчас разгляду хрысцінных абрадаў даследчык ставіць задачу вызначыць, якія з сучасных абрадаў і звычаяў, што суправаджалі рэлігійнае таемства, вядуць свой пачатак ад язычніцкага мінулага і як яны могуць быць растлумачаны. Ачышчэнне дзіцяці праз абмыванне і язычніцкае пасвячэнне яго бажаству (пострыгі), на думку Я.Ф.Карскага, знайшло адлюстраванне ў царкоўна-рэлігійных пострыгах – хрысціянская форма як адлюстраванне (перажытак) старажытнаязычніцкай.

Асобны раздзел народнай паэзіі Я.Ф.Карскі прысвяціў вывучэнню абрадавых песень, што суправаджалі вяселле. Выдадзенае на 23 гады пазней за працу М.В.Доўнар-Запольскага “Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках”, даследаванне Я.Ф.Карскага “Вясельныя абрады і песні” грунтуецца ў большай ступені на ўсходнеславянскай навуковай спадчыне (па частотнасці аналогій) [12]. Як прадстаўнікі эвалюцыянізму ў этнаграфіі абодва вучоныя разглядаюць вясельную абраднасць беларусаў у развіцці і сувязі з абраднасцю іншых славянскіх і неславянскіх народаў, але практычна выконваюць гэта па-рознаму. У сувязі з гэтым варта разгледзець іх у кантэксце гістарычнай змены навуковых школ на прыкладзе вывучэння вясельнай абраднасці.

Калі М.В.Доўнар-Запольскі ставіць цікавыя з этналагічнага пункту гледжання факты з паралельнымі фактамі з рытуалаў індаеўрапейскіх народнасцей (шукае аналогіі, што дазволіла праліць святло на генезіс і семантыку асобных звычаяў і абрадаў), то Я.Ф.Карскі разглядае беларускія вясельныя абрады і песні ў якасці зводнага, абагульненага матэрыялу. Аднак абодвух даследчыкаў яднае выбар фактаў, што ўтрымліваюць старажытны след, намінуючца імі як звычай ці абрад, які “ўказвае на старажытнае паходжанне”, “сведчыць пра тое, што мы маем справу з водгаласам мінулага”, “пераносіць нас у эпоху”, “з’яўляецца адлюстраваннем глыбокай старажытнасці” і г.д. Такім чынам, аўтары прадставілі вяселле ў культурна-

рэлігійных перажытках. Калі М.В.Доўнар-Запольскі ў пабудове паралельных радоў здолеў знайсці адзначанае пацверджанне і раскрыць сутнасць фактаў, то Я.Ф.Карскі, выкарыстоўваючы славянскую навуковую спадчыну, паказаў рознасць іх тлумачэння міфолагамі і эвалюцыяністамі, дапаўняючы гэтыя меркаванні ўласнымі высновамі. Адметна, што Я.Ф.Карскі неаднаразова дэманструе непаўнату тлумачэння факта міфолагамі, але часам пакідае гэта без каментару.

Характэрна, што праца Я.Ф.Карскага ў большай ступені падпарадкавана вызначанаму яшчэ М.В.Доўнар-Запольскім фармальнаму падыходу ў апісанні прадмета вывучэння – “па ходу” вяселля. Так, выключанае з працы апошняга царкоўнае вянчанне (як неістотнае па сваёй значнасці ў беларусаў і рускіх) было ўключана ў апісанне Я.Ф.Карскага, як і асобна вылучаны дзявочнік, які М.В.Доўнар-Запольскі толькі канстатаваў наяўным, звярнуўшы ўвагу на злучэнне яго з заручынамі або адсутнасць ў незаможных сем’ях.

Прадставіўшы паэтапна з’яўленне трох формаў шлюбу пасля першабытнага, Я.Ф.Карскі дапаўняе ўказаныя М.В.Доўнар-Запольскім перажыткі куплі-продажу нявесты на этапе сватаўства больш познімі: у прамовах сватоў і іх дзеяннях ён знаходзіць указанні на шлюб па дамове ў тых выпадках, калі ў нявесты пыталіся пра яе згоду на шлюб [12, с. 342].

У адрозненне ад М.В.Доўнар-Запольскага Я.Ф.Карскі разглядае вясельны абрад і песні як адзіны матэрыял для пошуку ўказанняў рэшткаў старажытнасці, уключаючы сюды аналіз усходнеславянскіх вясельных матываў, сімволікі, вобразнасці. Не новай для навукі з’яўляецца ідэя папарнага супастаўлення вобразаў-сімвалаў жаніха і нявесты. Аднак, калі М.В.Доўнар-Запольскі ажыццявіў яе на матэрыяле беларускага вяселля, то Я.Ф.Карскі прадставіў варыянтнасць спісу за кошт уключэння ўсходнеславянскай факталогіі [12, с. 383].

Ад Я.Ф.Карскага пайшла традыцыя намінацыі групоўкі дзеючых асоб вяселля “родам” жаніха і “родам” нявесты (хаця ўпершыню вызначэнне

радавой асновы большай часткі вясельнага рытуалу належыць М.В.Доўнар-Запольскаму), прызнанасць паходжання вясельнага роду як прамога пераемніка рэальнага патрыярхальнага роду, падзелу пакаленнага складу вясельнага роду ў адносінах да маладых як адбітку старажытнага радавога быту (малодшае і старэйшае пакаленне) [12, с. 360].

Вернемся да рознасці метадалагічных падыходаў. М.В.Доўнар-Запольскі вылучае паралельныя рады, Я.Ф.Карскі дае гістарыяграфічны агляд тлумачэнняў фактаў прадстаўнікамі міфалагічнай і эвалюцыйнай школы. Вызначыўшы сувязь вясельных песняў з песнямі, што выконваліся на іншых народных святах, асабліва на Каляды, Я.Ф.Карскі застаецца дуалістам у тлумачэнні вобразаў і сваяцкіх адносінаў у народных песнях пра падрыхтоўку да шлюбу, сам шлюб і пашлюбнае жыццё. Так, каментуючы абрадавае выкарыстанне пеўня і курыцы ў славян, ён тлумачыць адпаведныя песенныя вобразы, з аднаго боку, сімваламі новай сям’і, а з другога, як і міфолагі, бачыць тут рэшткі старажытных славянскіх ахвярапрынашэнняў богу сонца, прадстаўніком якога быў певень [12, с. 380].

Звяртаючыся да вывучэння абрадаў пры пахаванні і пахавальных прычытанняў, Я.Ф.Карскі адзначае наяўнасць розных напластаванняў у іх: дагістарычных, хрысціянскіх і сучасных [12, с. 389]. Як і ў адносінах да радзіннай і вясельнай абраднасці, даследчык падае гістарыяграфію вывучэння прадмета даследавання, адзначыўшы нязначную колькасць навуковых распрацовак па тэме. Выкарыстоўваючы метад перажыткаў, Я.Ф.Карскі спыняе ўвагу на двух спосабах пахавання – спальванні і пахаванні ў зямлю. Ён не ставіць мэту выявіць, які са спосабаў з’яўляецца больш старажытным, а толькі спрабуе растлумачыць сутнасць і паходжанне вылучаных звычаяў і абрадаў. На падставе гістарычных сведчанняў, унутранай і знешняй будовы прычытанняў Я.Ф.Карскі вызначае перажыткі старажытных вераванняў адносна смерці і замагільнага жыцця, а таксама іх зааморфнае прадстаўленне ў народных плачах і прымаўках. Асобна даследчык закранае пытанне пра прыватныя і агульныя хаўтуры па

нябожчыку, але не разглядае яго падрабязна, спасылаючыся на працу П.В. Шэйна.

Варта адзначыць, што крыніцазнаўчая база Я.Ф.Карскага тут значна меншая, чым у даследаваннях па радзіннай і вясельнай абраднасці. У яе склад у асноўным увайшлі летапісы, помнікі старажытнарускай літаратуры, асобныя навуковыя працы, рэлігійная літаратура.

Такім чынам, зводны характар працы Я.Ф. Карскага дае магчымасць даследчыку зрабіць гістарыяграфічны агляд вывучэння радзіннай, вясельнай і пахавальнай абраднасці беларусаў. Не меншая заслуга належыць яму як метадолагу-эвалюцыяністу, які практычна замацаваў навуковую канцэпцыю школы, дапоўніўшы і развіўшы апрабаваныя М.В.Доўнар-Запольскім стрыжнёвыя палажэнні.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, адзначым, што ідэалізм міфолагаў праглядаецца ў інтэрпрэтацыі сучаснай народнай творчасці як рэшткаў узвышаных старажытна-паэтычных поглядаў, мэтанакіраванай лакальнасці ахопу дахрысціянскіх рэлігійных вераванняў, звычаяў, абрадаў. Па сутнасці, канцэптуальнае “вышукванне” даўніны не дапускала думкі пра здольнасць развіцця прадмета вывучэння як вытворнага працэсу ў адносінах да яго творцы – народа.

Міфолагі не толькі абудзілі цікавасць да вывучэння духоўнай культуры, але і прадставілі метадалагічны інструмент, які выкарысталі эвалюцыяністы на новым тэарэтыка-філасофскім узроўні. Калі міфолагі перш за ўсё бачылі ў абраднасці рэшткі міфалагічнага светаўспрымання людзей старажытнага перыяду, то эвалюцыяністы, звярнуўшыся да яе, даследавалі культурна-рэлігійныя перажыткі, што ў гістарычнай рэтраспекцыі азначала прызнанне эвалюцыі як выніку зруху ў мысленні язычніцкай і хрысціянскай эпох. Упершыню адзін з агульных аспектаў даследавання (абраднасць) пераносіцца з пазачасавай плоскасці міфа ў гістарычны ракурс.

Адметна, што параўнальнае вывучэнне прадмета даследавання як падстава для ўласных высноваў (аналогія) было вядома міфолагам, якія

рэканструявалі дагістарычны светапогляд праз аналіз абраднасці і міфалогіі розных славянскіх народаў, а таксама пошук захаваных рэшткаў у сучаснай духоўнай культуры народа, канстатацыю ўплыву абрадаў, вераванняў, міфалогіі і язычніцкай рэлігіі.

Калі міфолагі зыходзілі з прызнання міфа стрыжнем народнага светапогляду, то эвалюцыяністы даследавалі перажыткі на культурна-рэлігійным падмурку, дэкларуючы цесную сувязь бытавых і рэлігійных з'яў (па сутнасці, прадставілі спрошчанае матэрыялістычнае разуменне эвалюцыі). Паралельныя рады-аналогіі М.В.Доўнар-Запольскага не заўсёды ўтрымліваюць факты, якія поўнасцю супадаюць як па форме, так і па змесце, на што, дарэчы, і сам даследчык звяртае ўвагу. Гэта сведчыць аб імкненні знайсці адзінства культурна-рэлігійных фактаў як доказ падабенства мыслення розных этнасаў.

Такім чынам, у 80-90-я гг. XIX ст., акрамя павелічэння збораў фактычных матэрыялаў па сямейнай абраднасці за кошт стварэння сеткі карэспандэнтаў (як новай формы збіральніцкай дзейнасці) альбо геаграфічнага пашырэння ўласна даследчай работы, праглядаецца выданне шматтомнага хрэстаматыйнага фонду як пачатак навуковай працы з элементамі сістэматызацыі. Найбольш багатая спадчына ў гэтым плане прыпадае на Смаленскую, Віцебскую, Магілуёскую і Мінскую губерні.

Першыя спробы навуковага даследавання сямейнай абраднасці адметныя выкарыстаннем тайлараўскага метаду перажыткаў, гісторыка-параўнальным асвятленнем прадмета вывучэння. Беларускае вяселле распрацавана на ўзроўні навукі таго часу, крыху менш увагі ўдзелена радзінам і пахаванню, што прадвызначыла якасную дыспрапарцыянальнасць іх вывучэння.

Новы падмурак аналізу праблемы сям'і быў забяспечаны суіснаваннем некалькіх навуковых школ: юрыдычнай, эвалюцыйнай. Прадстаўнікі апошняй часам выкарыстоўвалі высновы міфалагічнай школы. Так, калі дзейнасць юрыдычнай школы дала магчымасць значна ўзбагаціць

крыніцазнаўчую базу і адпаведна пашырыць спектр даследаванняў, то эвалюцыйная характарызавалася спрошчанай матэрыялістычнай методай выкладання прадмета даследавання ўвогуле.

Выкарыстанне сацыяльнага падыходу дазволіла замяніць агульныя апісанні 50-70-х гг. XIX ст. на дыферэнцыяваны аналіз сялянскай сям'і як крыніцы вывучэння побыту і культуры беларускага народа, носьбіта мясцовых звычаяў і традыцый. Шматграннасць прадмета вывучэння падштурхнула этнографаў да вызначэння канкрэтнай мэты і задач работы, вылучэння пэўных аспектаў у раскрыцці тэмы.

Асобныя спробы акрэсліць сямейны асяродак прадстаўлены праз вывучэнне праблемы дашлюбнага знаёмства і шлюбу ў беларусаў, маральны і прававы аспект жыццядзейнасці сям'і, стварэнне асобных абразкоў членаў сямейнага калектыву праз паглыбленне да ўзроўню псіхалогіі, вылучэнне тыповых сямейных мадэляў, нораваў маладых, функцыянальных абавязкаў, свядомаснай адзнакі сацыяльна прынятых і асацыяльных правілаў і нормаў паводзінаў у сям'і.

Аднак усе гэтыя працы характарызаваліся геаграфічнай лакальнасцю на ўзроўні губерні, ствараючы мазаічны тэрытарыяльны абразок беларускай сялянскай сям'і, змест якога залежыў ад аўтарскай назіральнасці, аспектнага вывучэння, падбору крыніцазнаўчай базы, адметнасці стылю падачы фактычнага матэрыялу.

Такім чынам, станаўленне гістарыяграфіі праблемы сям'і беларусаў у канцы XIX ст. характарызуецца паступовым вылучэннем сямейна-бытавой сферы ў асобны прадмет даследавання. Падарожныя нататкі, мемуарныя ўспаміны канца XVIII-XIX стст. саступілі месца, дапоўніліся праграмнымі даследаваннямі і мэтанакіраванымі аўтарскімі распрацоўкамі з выкарыстаннем пэўнай методыкі вывучэння.

## Літаратура:


1. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка быта и языка русского населения Северо-Западного края: В 3 т. СПб.: Императ. Акад. наук. 1887-1902. Т.1, ч.2: Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. 1890. 708 с.
2. Романов, Е.Р.Белорусский сборник. Вильно: Тип. А.Г.Сыркина. 1912. Вып. 8: Быт белоруса. 600 с.
3. Шлюбскі, А.А. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны: В 2 ч. Мінск: Ін-т Бел. культуры. 1928. Ч. 2. 265 с.
4. Довнар-Запольский, М.В. Белорусская свадьба и свадебные песни: этногр. этюд. Киев: Тип. А.Давиденко. 1888. 38 с.
5. Довнар-Запольский, М.В. Заметки по белорусской этнографии // Живая старина. 1893. Вып. 2. С.283-296.
6. Довнар-Запольский, М.В. Белорусская свадьба в культурно-религиозных пережитках // Довнар-Запольский М.В. Исследования и статьи. – Киев: Изд. А.П.Сапунова, 1909. – С.61-146.
7. Довнар-Запольский М.В. Первобытные формы брака // Довнар-Запольский М.В. Исследования и статьи. – Киев: Изд. А.П.Сапунова, 1909. – С.384-404.
8. Токарев С.А. История зарубежной этнографии. М.: Высш. шк., 1978. – 350 с.
9. Довнар-Запольский М.В. Очерки семейственного обычного права крестьян Минской губернии // М.В. Довнар-Запольский Исследования и статьи. Киев: Изд. А.П.Сапунова. 1909. С.2-60.
10. Добровольский, В.Н. Очерки семейных нравов // В.Н. Добровольский. Смоленский этнографический сборник: В 4 ч. СПб.: Тип. С.Н.Худекова. 1893. Ч.2. С.338-378.
11. Брандт, А. Юридические обычаи крестьян Могилевской губернии. СПб.: Тип. А.С.Суворина. 1904. 22 с.
12. Карскі, Я.Ф. Очерки словесности белорусского племени // Я.Ф. Карскі Беларусы. Мінск: Бел. кнігазбор. 2001. 640 с.